здавалася б, не зусім творчай працы – кнізе “Народу свайму служачы”. Хоць яна з’яўлялася толькі складальнікам, але якая была выканана праца: умясціліся пад адным радком 48 аўтараў, якія мелі адносіны да жыцця і творчасці Ф. Скарыны. З яе вывадам нельга не пагадзіцца, таму што творы, па яе разуменні, павінны “крануць сэрца чытачоў, абудзіць цікавасць да роднай гісторыі, спадчыны, да нашай велічнай і спеўнай мовы, каб мы “забыць не маглі свайго радаводу”.

А яшчэ былі шматлікія рэцэнзіі, крытычныя артыкулы, пазаўрочныя мерапрыемствы і са студэнтамі, і са школьнікамі і іх настаўнікамі, актыўная дзейнасць па перадачы багацця беларускай мовы і літаратуры не толькі да моладзі, але і да самых шырокіх слаёў беларускай грамадскасці. І ўсё гэта канцэнтравалася на галоўнай мэце: што яшчэ трэба зрабіць, каб дзеткі беларусаў ведалі сваю мову і літаратуру, адчувалі сябе, як паўнапраўныя беларусы.

Літаратура

1. Белинский, В.Г. Избранные педагогические сочинения / В.Г. Белинский. – М.–Л., 1948. – С. 18.
2. Яфімава, М. Беларуская савецкая дзіцячая літаратура 40–50-х гадоў / М. Яфімава // Беларуская дзіцячая літаратура. – Мінск, 1980. – С. 83.
3. Тамсама. – С. 87.
4. Яфімава, М.Б. Літаратурныя вечары ў школе / М.Б. Яфімава. – Мінск, 1977.

В.І. Русілка (Віцебск)

МАСТАЦКАЕ АСЭНСАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАГА ЛЁСУ БЕЛАРУСА Ў РАМАНАХ У. ГНІЛАМЁДАВА

З’яўленне гістарычнай тэтралогіі У. Гніламёдава “Уліс з Прускі” (2006), “Расія” (2007), “Вяртанне” (2007), “Валошкі на мяжы” (“Полымя”, 2009, № 8-9) стала годным адказам на заканамернае пытанне пра наяўнасць у сучаснай беларускай літаратуры твораў, якія можна было б паставіць у адзін шэраг з неаспрэчнай класікай – раманамі Я.Коласа, К.Чорнага, І.Мележа. Гэтую думку можна падмацаваць спасылкамі на незвычайна актыўнае для сённяшняга літаратуразнаўства асэнсаванне і аднадушна высокую ацэнку твораў пісьменніка ў перыядычным друку (даследаванні В.Локун, Я.Гарадніцкага, М.Мішчанчука, З.Драздовай, інтэрв’ю з пісьменікам М. Мікуліча, В.Паклонскай, У.Давыдава, ацэнка твораў у артыкулах В.Жураўлёва і А.Раманчука і інш.). Для У.Гніламёдава-акадэміка, доктара філалагічных навук, аўтара паўтара дзесятка манаграфій і звыш трох з паловай соцень артыкулаў, зварот да мастацкай творчасці і да вялікіх эпічных форм быў усвядомленай неабходнасцю. Справа ў маштабнасці задачы, якую паставіў перад сабой аўтар: стварыць у раманах гісторыю беларускага народа праз гісторыю сваёй сям’і, паказаць, як гаворыць сам У. Гніламёдаў, “чалавека XX стагоддзя, ці, дакладней, чалавека ў плыні часу мінулага стагоддзя” [1, с. 4] Справа і ў тым, што вырашэнне гэтай звышскладанай задачы атрымалася сапраўды высокамастацкім, таленавітым і цікавым для чытача.

Пагодзімся з вывадам В.Жураўлёва аб тым, што нават у эпоху глабальнага наступлення Інтэрнэту роля вялікіх эпічных твораў не губляецца. Прызнаючы папулярнасць малых празаічных форм, адзначым, што“сечкі-зацемкі” – гэта ўсё ж для філалагічна падрыхтаванага чытача, выхаванага на брылёўскім лірызме. Для звычайнага чытача больш запатрабаваным застаецца класічны добры эпас з цікавай і новай тэмай, падрабязна выпісаным сюжэтам, героямі, подыхам часу і дакладнасцю побытавых, пейзажных, партрэтных малюнкаў, з пазнавальным зместам. Менавіта такімі асаблівасцямі вызначаецца гістарычная хроніка У.Гніламёдава.

Раман “Уліс з Прускі” пачынаецца з назвы – удалай, інтрыгуючай, густа замешанай на класічнай антычнай традыцыі і беларускім каларыце. Канцэптуальнай, бо адразу заяўлены ўласцівы ўсім творам Гніламёдава – празаіка прыём цытацыі (Уліс – Адысей, а чацвёртая і пятая частка рамана якраз і расказваюць пра поўнае прыгод сямігадовае падарожжа беларуса Лявона Кужаля, прататыпам якога стаў дзед пісьменніка Лявонцій Міхайлавіч Сцепанюк, ў Амерыку). Аднак гаварыць, што змест твора вызначаецца менавіта гэтымі часткамі, было б не зусім правільна, хоць яны, безумоўна, самыя займальныя, лёгкія для ўспрымання і напісаны на абсалютна новым для нашай літаратуры фактычным матэрыяле. Большая ж частка рамана, тры яго першыя раздзелы, прысвечаны няспешнаму, спрадвечнаму ў сваёй усталяванасці і традыцыях жыццю палескай вёскі Пруска напачатку ХХ стагоддзя.

Першая, палеская частка рамана выклікае паралель з Коласам і па часе, які апісваецца, і па этнаграфічнай дакладнасці і эпічнай немітуслівасці думкі. Аднак найбольш яўная сувязь гэтай часткі твора – з мележаўскімі “Людзьмі на балоце”. Акрамя відавочных паралеляў у вобразнай і сюжэтнай сістэме твораў, багацця этнакультурных звестак, гэтыя творы аб’ядноўвае галоўнае – погляд на гісторыю з пункту гледжання беларуса-селяніна, асэнсаванне зямлі і працы на ёй як асновы чалавечага жыцця. І ў гэтым сэнсе вобраз Лявона Кужаля безумоўна нацыянальны архетып, які стаіць упоравень з героямі беларускай класічнай літаратуры – Міхалам з паэмы Я.Коласа “Новая зямля” і Васілём Дзятлам з “Палескай хронікі” І.Мележа.

З вобразам галоўнага героя неадрыўна звязаны топас дарогі, спачатку блізкай – у Камянецкае народнае вучылішча, якое дало веды і пазнаёміла з нелегальнай літаратурай; затым далёкай, – у Амерыку, якая канчаткова сфарміравала характар, і, з трывогай і няпэўнасцю, – назад ў Пруску. Гэта ў першай кнізе. У другім рамане, “Расія”, канцэпт дарогі набывае больш трагічны і змрочны сэнс (ён нечым нагадвае шлях купалаўскіх “Паязджан”) – гэта горкі шлях бежанцаў з Прускі ў далёкую Самарскую губернію, жахлівыя і бессэнсоўныя дарогі салдата Першай сусветнай вайны і, нарэшце, зноў пакутлівае вяртанне да парога бацькоўскай хаты. Яно і дало назву трэцяму раману “Вяртанне”, але ў ім, як і ў раздзелах з “Валошак на мяжы”, немалады ўжо Лявон ужо менш знаходзіцца ў дарозе рэальнай, затое больш шукае духоўна.

Раман “Расія” ў часопісным варыянце публікаваўся з падзагалоўкам “Сямейная хроніка ў духу барока” і мае дакладныя храналагічныя межы: 1915 – 1922 гады. Аўтар расказвае пра чалавека ў віры лёсавызначальных для славянскіх народаў падзей – Першай сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года, калектывізацыі і грамадзянскай вайны. Наватарства У. Гніламёдава ў тым, што ён узнаўляе добравядомыя і апісаныя ў літаратуры падзеі з пункту гледжання сучаснага лёсу двух братніх народаў – рускага і беларускага, бо прускаўскія бежанцы перажываюць цяжкія часы ў патрыярхальным самарскім сяле Запалонне, дзе іх прынялі як братоў, з цеплынёй і ўвагай.

Ідэя “агульнасці славянскага дому” (В.Локун) [2] знаходзіць сваё канкрэтнае ўвасабленне ў тым, што сям’я Кужалёў жыве ў хаце “буйнога стэпавага гаспадара” Ільі Платонава. Аўтарская ўстаноўка на сцвярджэнне еднасці рускага і беларускага народа ўвасабляецца і праз тое, што запалонаўская Фёкла становіцца лёсам і адзіным каханнем Лявона.

Самыя трагічныя старонкі рамана прысвечаны падзеям Першай сусветнай вайны і рэвалюцыі, надыход якіх успрымаецца як страшнае насланнё, выпрабаванне чалавечнасці. Безумоўна, У. Гніламёдаў абапіраецца на вопыт сусветнай літаратуры, якая асуджае вайну (Э.- М. Рэмарк, А.Барбюс, Э.Хэмінгуэй, М.Горкі), працягвае традыцыі М.Гарэцкага (“На імперыялістычнай вайне”). “Вайна перакрэсліла ўсе ўяўленні аб жыцці. Яна была вялікім прыніжэннем для чалавека” [3, с.273].

Рэвалюцыйныя падзеі падаюцца праз хранікальна-дакладнае аўтарскае апісанне палітычнага становішча, уключэнне рэальных дакументаў часу, якія У. Гніламёдаў вывучаў у самарскіх архівах, і іншых пазасюжэтных элементаў (дзённікі, рэфлексіі герояў). У дачыненні да той часткі рамана, якая расказвае пра падзеі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, як і ў дачыненні да наступнага рамана "Вяртанне", робіцца асабліва відавочным вывад В. Локун пра падзел раманнага поля на дзве стылёва адрозныя апавядальныя лініі, "вобразна-псіхалагічную і хранікальна-падзейную" плыні [2].

Раман "Вяртанне" прысвечаны жыццю народа Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы, пра якое аўтар з уласцівай яму дасведчанасцю і ўвагай да факта расказвае як вуснамі Лявона і яго аднавяскоўцаў, так і мовай дакументаў. Часцей, у параўнанні з папярэднімі творамі, аўтар перадае функцыі наратара бальшавіку Андрэю Кляновіку, і тады мяняецца аўтарская мова, болей жорсткімі і адназначна бунтарскімі становяцца ідэйныя акцэнты. Хоць аўтар неаднаразова называе Кляновіка і Кужаля сябрамі, адзінства поглядаў у іх няма: у спрэчцы пра класавую барацьбу Лявон гаворыць, што беларусаў выратуе працавітасць і адчувае штучнасць і рызыкоўнасць праграмы Кляновіка. Часцей жа Лявон у такіх размовах проста маўчыць.

Багаты фактычны матэрыял, як ні дзіўна, не шкодзіць лёгкасці ўспрымання твора, як і апублікаваных раздзелаў рамана "Валошкі на мяжы". Грамадска-палітычная падзейнасць ўдала дапаўняецца цікавымі фактамі з сямейнай хронікі і новымі, арыгінальнымі звесткамі пра побыт вяскоўцаў, звычаі, сельскагаспадарчую працу.

Арыентуючыся на класічную эпічную традыцыю, пісьменік узбагачае яе ў адпаведнасці з дасягненнямі сучаснай апавядальнай паэтыкі. Так, будуючы сюжэт, аўтар выкарыстоўвае, побач з традыцыйным лінейным апавяданнем, прыёмы вяртання, забягання наперад, "шахматнага" размяшчэння фабульнага часу, вядзе нарацыю ад імя розных асоб (у тым ліку і праз дзённікі, ліставанні). Гэта, безумоўна, ажыўляе чытацкую ўвагу, як і прыём загадкі (так, у першым рамане мы даведаліся пра трагічную смерць Ганны, аднак толькі ў "Вяртанні" аўтар адназначна гаворыць пра тое, што Трахім бязлітасна штурхнуў жонку пад колы цягніка). Увядзенне аўтарскіх разваг, цытаванне гістарычных дакументаў, апісанне побыту ўдала спалучаецца з дынамічнымі, лёгкімі, неабцяжарнымі аўтарскай мовай дыялогамі. Асаблівым майстэрствам вызначаюцца разнастайныя, адпаведныя аўтарскай ідэйнай устаноўцы, паэтычныя пейзажы, насычаныя вобразна-выяўленчымі сродкамі і мясцовай канкрэтыкай. Сапраўднай удачай аўтара стала сістэма выдатных вобразаў-персанажаў, прычым і героі, і другародныя, і дапаможныя, і нават выпадковыя персанажы падаюцца праз разнастайныя спосабы экспазіцыі і характарыстыкі (у прыватнасці, праз яркія дэталі партрэту, моўную індывідуалізацыю, унутраныя маналогі).

Моўнае майстэрства У.Гніламёдава заключаецца ў зайздросным лексічным багацці, ва ўмелым стварэнні мясцовага каларыту, мэтазгодным увядзенні іншамоўнай лексікі (рускай, англійскай, польскай, яўрэйскай, украінскай).

У.Гніламёдаў называе сябе наратыўшчыкам і постмадэрністам. З тым, што гэта постмадэрнізм, адназначна не згодна В.Локун, менш катэгарычна – З. Драздова. М.Мішчанчук звяртае ўвагу на інтэртэкстуальнасць і прыёмы модульнай паэтыкі, аднак таксама не вызначае мастацкі метад, якім карыстаецца пісьменнік, як постмадэрнізм. На нашу думку, цытацыя, відавочная ў творах У.Гніламёдава, не мае дачынення да постмадэрнізму, тыпалагічнай прыкметай якога з'яўляецца іронія, сцвярджэнне анамальнага становішча традыцыйных форм у сённяшняй літаратуры. Для постмадэрнізму ўласціва эклектыка любых форм традыцый, У.Гніламёдаў цытуе пераважна класіку рэалістычнай літаратуры. Выкарыстанне гатовых форм, сітуацыя мастацкага запазычання выкарыстоўваецца постмадэрністамі пераважна з мэтай кампенсаваць недахоп уласнага зместу, што У.Гніламёдаву не пагражае. Пра постмадэрнізм у яго творчасці

можна гаварыць хіба ў сэнсе рэабілітацыі мастацкай традыцыі, перш за ўсё рэалізму. Мы б вызначылі мастацкі метад У.Гніламёдава як новы рэалізм, што на сучасным эстэтычным узроўні выкарыстоўвае дасягненні беларускага і сусветнага класічнага рэалізму.

Творы У.Гніламёдава ўжо сталі самай значнай з'явай сучаснага літаратурнага працэсу. Калі дадаць, што хутка будуць апублікаваны новыя часткі рамана "Валошкі на мяжы" і аўтар закончыў новую кнігу, у якой адлюстраваны падзеі Другой сусветнай вайны, то можна канстатаваць новы ўздым беларускай прозы, якая годна асэнсоўвае гістарычны лёс свайго народа.

Літаратура

1. П'едэстал для творцаў // Літаратура і мастацтва. – 2007. – 19 кастрычніка.
2. Локун, В. Проза Уладзіміра Гніламёдава / В. Локун // Полымя. –2009.– №2. – С. 165 – 173.
3. Гніламёдаў, У. Расія / У. Гніламёдаў. – Мінск : Харвест, 2007. – 672 с.

І.В. Саматой (Віцебск)

АСВЕТНІЦКАЯ І ЛІТАРАТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ АНДРЭЯ ЗЯЗЮЛІ

У горадзе Сянно Віцебскай вобласці пражыў апошнія гады і быў пахаваны Зязюля Андрэй (Астрамовіч Аляксандр Сцяпанавіч) – ксёндз, беларускі паэт-адраджэнец. Нарадзіўся 26 лістапада 1878 года ў сялянскай сям'і Сцяпана і Ганны Астрамовічаў, у вёсцы Навасады Гальшанскай гміны Ашмянскага павета (цяпер Астравецкі раён). Калі арыентавацца на прыхадскі спіс Гальшанскага рымска-каталіцкага касцёла за 1884 год, то датай нараджэння будучага паэта можна лічыць 1880 год. Пачатковую адукацыю атрымаў у Гальшанах. У 1892 годзе заканчыў Ашмянскае павятовае вучылішча. Пасля працаваў на гаспадарцы бацькоў. З 1 студзеня 1901 да 14 верасня 1903 года служыў у 160-м пяхотным Абхазкім палку ў Гомелі і ў Барысаве. Закончыў службу ў званні малодшага афіцэра.

Мара стаць святаром прыводзіць маладога Астрамовіча ў Вільню. Але паступіць у духоўную семінарыю перашкодзілі ўлады, якія не прынялі беларускасці Астрамовіча. Не пакідаючы надзеі, ён едзе ў студзені 1906 года ў Пецярбург, дзе здае экзамены на званне аптэкара, чым засведчыў веданне асноў лацінскай мовы, неабходнае для паступлення ў Пецярбургскую духоўную каталіцкую семінарыю, якую паспяхова скончыў у 1910 годзе і быў пасвечаны ў святары.

Душапастырскую дзейнасць пачаў вікарыем ракаўскага касцёла і першую сваю імшу адправіў 2 лютага 1911 года ў вёсцы Трабы Валожынскага павета. З 2 ліпеня 1912 і да лютага 1915 года служыў у парафіі Анопаль Мінскага дэканата. Пазней быў прызначаны вікарыем у Бабруйскую парафію. Са снежня 1916 года служыў у мястэчку Смілавічы Ігуменскага павета. З 9 верасня 1914 года ксёндз Астрамовіч служыць на Віцебшчыне: пробашч касцёла ў Абольцах Аршанскага дэканата. З 1919-1921 гг. А. Астрамовіч – апошні ксёндз касцёла Святой Троіцы ў мястэчку Сянно, дзе і памёр 17 студзеня 1921 года. Лічыцца, што пахаваны ён на мясцовых каталіцкіх могілках, але магіла не была знойдзена. Магчыма, што Астрамовіч як ксёндз пахаваны на дзядзінцы касцёла, які, на жаль, быў разбураны ў 1961 годзе. З 29 лістапада 2003 года ў час святкаванняў 125-годдзя з дня нараджэння беларускага паэта Андрэя Зязюлі, на Сенненскіх могілках адбылося асвячэнне сімвалічнай магілы паэта.

Андрэй Зязюля быў вядомым культурным і грамадскім дзеячам пачатку XX ст. Літаратурная і асветніцкая дзейнасць яго была звязана з вытокамі беларускага хрысціянскага руху першай трэці XX ст., мэтай якога было адраджэнне дэмакратычнай, незалежнай Беларусі. Лідэр руху – публіцыст, тэолаг, філосаф, ксёндз Адам Станкевіч у